**УДК 726.6**

**Тамара Габрусь**

# Гісторыка-архітэктурны ландшафт старажытнага Заслаўя

Здійснено історичний та архітектурно-стилістичний аналіз двох храмів стародавнього міста Заславля – літописного Ізяслава. Простежено зміни, які відбулися у середині XVI ст. на конфесійній карті Великого князівства Литовського внаслідок розширення ідеології загальноєвропейської реформації. Наведено кількісні дані щодо скорочення католицьких парафій та виникнення кальвіністських, лютеранських і аріанських общин.

На прикладі двох храмів м. Заславля – колишньої кальвіністської Спасо-Преображенської церкви і костелу Різдва Богородиці висвітлено процес започаткування будівництва власне протестантських кам’яних храмів у Білорусі часів Речі Посполитої, а також стильові зміни протягом наступних років аж до ХХ ст. Охарактеризовано особливості стилю так званого «віленського бароко».

*Ключові слова*: реформаційний рух, кальвіністський собор, конфесійна боротьба, костел домініканців, православна церква, місцевий ренесанс, віленське бароко

**Tamara Gabrus**

**Historical and architectural landscape of ancient Zaslawye**

The historical, architectural and stylistic analysis of two temples of the ancient town Zaslawye – known in chronicles as Izyaslav – is done. The changes that have occurred in the middle of the 16th century on a confessional map of Grand Duchy of Lithuania due to the expansion of the ideology of *pan*-European *Reformation are traced*. A qualitative data regarding reduction of Catholic parishes and emersion of Calvinist, Lutheran, and Arian communities is specified.

On the example of two temples in Zaslawye – former Calvinist Holy Transfiguration Church and the church of Nativity – the process of launching the construction of Protestant stone churches in Belarus since the Polish–Lithuanian Commonwealth and its stylistic changes over the next years until the 20th century are shown. The features of the style of so-called «Vilna baroque» are defined.

*Keywords:* Reformation movement, Reformed church, confessional conflict, church of Dominicans, Orthodox Church, local Renaissance, Vilna Baroque

Геаграфічны тэрмін «ландшафт», што ўключае ўсе асноўныя прыродныя кампаненты мясцовасці, усё часцей ужываецца таксама да характарыстыкі яе духоўнага гісторыка-культурнага стану. Праз архітэктурна-мастацкі вобраз старажытнага Заслаўя чырвонай ніткай праходзіць гісторыя ўсёй Беларусі. Пра перыяд фарміравання

тут усходнеславянскай дзяржаўнасці і хрысціянскіх святынь сведчаць летапісы і археалагічныя помнікі. У сярэдзіне X ст. на правым беразе рэчцы Свіслач за 27 км уверх па цячэнню ад Мінска, сучаснай сталіцы Беларусі, існавала неўмацаванае паселішча крывічоў. Менавіта сюды кіеўскім князем Уладзімірам Святаслававічам была саслана жонка-выгнанніца полацкая князёўна Рагнеда (Гарыслава) з сынам Ізяславам, пасля замаха на жыццё мужа ў 987 г. З лёсам Рагнеды звязаныя мясцовыя водныя тапонімы – назвы рэчак Княгінька і Чарніца, а таксама ўзнікненне тут на мяжы X–XI ст. умацаванага дзяцінца, з якога і пачаўся сучасны горад Заслаўе (летапісныя назвы Ізяславль, Жеславль, Жаславль) [1]. У гэты час княжацкі прастол у Полацку зноў занялі Рагвалодавічы (Ізяслававічы), а Ізаслаўль стаў парубежным горадам-крэпасцю Полацкага княства. Упершыню, як горад, які мае свайго князя, ён упамінаецца ў летапісах пад 1127 г. З 1160 г. заслаўскае княства ўваходзіла ў склад Мінскай зямлі, а з пачатку XIV ст. – у склад Вялікага княства Літоўскага. З 1345 г. Заслаўль належаў князю Еўнуту Гедымінавічу і яго спадчыннікам, якія мелі тытул князёў заслаўскіх [2].

Пасля хрышчэння гістарычнай Літвы ў каталіцтва, ажыццёўленае ў 1387 г. каралём Польшчы і вялікім князем літоўскім Ягайлам, на тэрыторыі сучаснай Беларусі пачалі ўзнікаць шматлікія каталіцкія парафіі. Паводле падання, каталіцкая парафія ў Заслаўі заснавана ў 1420 г. тагачасным князем заслаўскім і адначасова пабудаваны першы драўляны парафіяльны касцёл. Аднак, у сярэдзіне XVI ст. на канфесійнай карце Вялікага княства Літоўскага адбыліся істотныя змены, якія выклікала пашырэнне ідэалогіі агульнаеўрапейскай рэфармацыі. Значная, магчыма, нават большая частка тутэйшых магнатаў і шляхты адмовіліся ад свайго ранейшага праваслаўнага альбо каталіцкага веравызнання, стаўшы прыхільнікамі новай канфесіі. Гістарычныя дакументы сведчаць, што ў другой палове XVI ст. колькасць кальвінскіх, лютэранскіх і арыянскіх збораў у Вялікім княстве дасягнула 177, з іх 92 – на беларускіх землях, у тым ліку толькі ў Навагрудскім павеце – 31, Мінскім – 11, Віцебскім – 7 і г.д. збораў, пры гэтым колькасць каталіцкіх парафій скарацілася больш, чым напалову ў параўнанні з 1550 г. Характэрна, што большасць мураваных кальвінскіх збораў узведзена прынамсі

на Міншчыне, што падаецца нейкай дэмаркацыйнай зонай паміж этнічнай Літвой і Белай Руссю, адпаведна паміж тэрыторыямі з перавагай праваслаўнага альбо каталіцкага насельніцтва.

Пэўнае кола сепаратысцкі настроеных магнатаў і шляхты і надалей падтрымлівала рэфармацыйны рух, што надало руска-шведска-польскай вайне сярэдзіны XVII ст. у межах Вялікага княства Літоўскага характар вайны канфесійна-грамадзянскай. У выніку яе наступстваў сацыяльная база пратэстантызму на Беларусі была цалкам вынішчана. Пасля Андросаўскага перамір'я 1667 г. каталіцкі касцёл не толькі вярнуў сабе пераважную частку святыняў на гэтай тэрыторыі, страчаных у перыяд рефармацыі, але таксама адбудаваў дзясяткі касцёлаў, спаленых альбо спустошаных маскоўскімі і шведскімі войскамі падчас «патопа» (Г. Сенкевіч). Амаль усе мураваныя кальвінскія зборы былі перароблены ў касцёлы, а пазней, у XIX ст., пры Расійскай імперыі, рэканструяваны ў праваслаўныя цэрквы, у выніку чаго ў значнай ступені страцілі свае аўтэнтычныя рысы. Некаторыя помнікі пратэстанцкага храмабудаўніцтва цалкам зруйнаваны ўжо ў XX ст.

На этапе пашырэння рэфармацыйнага руху большасць кальвінскіх збораў была створана на аснове храмаў іншых канфесій, пераважна шляхам перабудовы існуючых на той час гатычных касцёлаў, паколькі готыка як мастацка-тэалагічная канцэпцыя каталіцызма цалкам не прымалася пратэстантамі. Архітэктура і семантыка пратэстанцкіх храмаў увасабляла ідэалогію, апазіцыйную той, што зыходзіла з Ватыкана. Таму пашырэнню эстэтычнай канцэпцыі барока на мяжы XVI–XVII стст. храмабудаўніцтва пратэстантаў супрацьпаставіла ўстойлівыя традыцыі мясцовага рэнесанса. Архітэктура пратэстанцкіх збораў, параўнальна з касцёльнай, вызначалася большым аскетызмам і лапідарнасцю формаў, што было абумоўлена імкненнем гэтай канфесіі да больш таннай і сціплай рэлігійнай абраднасці а таксама іншай тэалагічна-канфесійнай праграмай [3].

Як гэта не парадаксальна, капітальнае будаўніцтва ўласна пратэстанцкіх мураваных храмаў, з выяўленай канфесійнай праграмай, пачалося ў часы, калі рэфармацыйны рух стаў апазіцыйным да дзяржаўнай ідэалогіі, што адбылося ўжо на мяжы XVI і XVII стагоддзяў. У кантэксце стылявой эвалюцыі беларускай архітэктуры

часоў Рэчы Паспалітай культавыя помнікі пратэстантызму складаюць некалькі асобную і адметную групу з прычыны сваёй канфесійнай спецыфікі. Адным з трох галоўных прынцыпаў пратэстантызма з'яўляецца свяшчэнства ўсіх дарослых, хрышчаных па веры. Як вядома, пратэстантызм адмаўляе ўсе рэлігійныя таінствы, акрамя хрышчэння і прычасця. Гэтыя палажэнні, у сваю чаргу, адмаўляюць неабходнасць алтара як сакральнага месца для святара, што знайшло адлюстраванне ў архітэктуры рэфармацкіх храмаў разглядаемага перыяду. У іх акцэнт робіцца не на алтары, а на кафедры прапаведніка. Характэрна, што найбольш адметнай рысай у архітэктуры рэфармацкіх храмаў Беларусі азначанага перыяду з'яўляецца адсутнасць алтарнай апсіды. Узорам для іх з'яўляўся архетып скініі Майсея, апісаны ў Старым Запавеце. Кальвінскія зборы таго часу звычайна мелі плоскую альбо трохгранную алтарную сцяну. Паводле архітэктурна-мастацкай стылістыкі пратэстанцкія храмы маюць найболей выяўленыя рысы мясцовага рэнесанса сярод іншых кірункаў сакральнага дойлідства Беларусі.

XVI стагоддзе ў гісторыі горада было адзначана падзеямі, звязанымі з будаўнічай дзейнасцю князёў Глябовічаў, ва ўладанне якіх горад перайшоў у 1539 г. Яны пераўтварылі дзядзінец старажытнага горада ў сваю рэзідэнцыю і ўмацавалі яе паводле навейшай па тым часе стараітальянскай рэгулярнай сістэмы фартыфікацыі [4]. У 1577 г. паводле фундацыі князя Яна Глябовіча, ваяводы троксксага, актыўнага прыхільніка рэфармацыйнага руху ў Вялікім княстве Літоўскім, у цэнтры замкавых умацаванняў Заслаўя пастаўлены мураваны кальвінскі збор, які з'яўляецца найбольш раннім дакладна датаваным мураваным пратэстанцкім храмам ў Беларусі. Раней пачатак яго будаўніцтва памылкова датавалі сярэдзінай XVI ст. У тэстаменце ад 28 ліпеня 1590 г. фундатар адзначае: «... у замку заслаўскім збор... добра пачаты і можа быць дабудаваны, настойліва аб гэтым прашу» [5]. Далей ён перасцерагае сваіх нашчадкаў ад адступлення ад евангеліцкай веры, але гісторыя распарадзілася так, што ўжо яго сын Аляксандр, кашталян віленскі, перайшоў у каталіцтва ў першай трэці XVII ст.

Першапачаткова заслаўскі кальвінскі збор уяўляў сабою простакутны аб'ём (23 × 15 м), без алтарнай апсіды і ўваходнай вежы,

накрыты высокім клінаватым дахам, з тоўстымі сценамі і байніцамі. Найбольш адметнай рысай у яго архітэктуры, як і большасці рэфармацкіх храмаў азначанага перыяду, з'яўляецца адсутнасць алтарнай апсіды. Залавы інтэр'ер кафалікона перакрыты крыжастымі скляпеннямі на падпружных арках, што абапіраюцца на ўнутраныя пілоны-контрфорсы, а 2-часткавая паўпадземная крыпта – важкімі цыліндрычнымі рэнесанснымі скляпеннямі. Рытмічна размешчаныя аконныя праёмы маюць рэнесансныя паўцыркульныя арачныя завяршэнні. Ярусы вежы і франтоны прарэзаны невялікімі круглымі люнетамі, якія, магчыма, мелі абарончую функцыю. Плоская алтарная сцяна завяршаецца амаль роўнабаковым трохвугольным франтонам, у дэкаратыўна-семантычнай кампазіцыі якога дамінуе крыж. Падобная кампазіцыя знаходзілася першапачаткова і на галоўным фасадзе храма. Маналітнасць і строгую геаметрычнасць архітэктурных форм збудавання падкрэслівае сціплы рэнесансны дэкор у выглядзе руставаных пілястраў вонкавых сцен, аркатурнага пояса і плоскіх прамавугольных нішаў, што аздабляюць атыкавы ярус. Прастата і гарманічнасць мас будынка сведчаць пра тэндэнцыю рэфармацкай царквы да большай дэмакратычнасці і таннасці, параўнальна з каталіцкай, але ў сукупнасці з выразным архітэктурна-ландшафтным асяроддзем старажытнага замчышча надаюць помніку непаўторнае аблічча.

У пачатку XVII ст. спадчынны ўладальнік Заслаўя князь Мікалай Глябовіч, кашталян віленскі, навярнуўся ў каталіцтва, адрадзіў мясцовую парафію і пабудаваў новы драўляны касцёл, асвечаны ў 1628 г. пад тытулам Нараджэння Найсвяцейшай Дзевы Марыі. Пасля «патопа» сярэдзіны стагоддзя ў 1669 г. мураваны кальвінскі збор таксама стаў касцёлам і асвечаны ў 1676 г. пад тытулам Міхаіла Арханёла. З 1678 г. Заслаўль стаў належаць князям Сапегам. У 1684 г. Казімір Ян Павел Сапега з жонкай Хрысцінай (з Глебовічаў) заснавалі пры касцёле Міхаіла Арханёла кляштар жабрацкага каталіцкага ордэна дамініканцаў, надзвычай пашыранага ў Вялікім княстве Літоўскім у той час. Манахам была перададзена заходняя частка замка, дзе яны пабудавалі двухпавярховы драўляны жылы корпус з сям'ю келлямі, рэфэктажам (трапезнай) і бібліятэкай. У комплекс уваходзілі таксама 2 стайні, свіран, лядоўня, кухня. Пры кляштары дзейнічалі школа і шпіталь [6].

Верагодна, менавіта пры прыстасаванні былога збора пад касцёл да будынка з захаду прыбудавалі магутную 35-метровую шмат’ярусную вежу-званіцу, званую ў гісторыі еўрапейскай архітэктуры «вестверк» (ці заходняя пабудова). Падобныя вежы былі распаўсюджаны ў архітэктоніцы сабораў нямецкай готыкі. Яны прыбудоўваліся да галоўнага заходняга фасада храма і мелі адпаведны гатычны дэкор у выглядзе вімпергаў, крабаў, стральчатых парталаў. Стрыманая, нават аскетычная, вежа заслаўскага храма па свайму архітэктурнаму вобразу і дэкаратыўнай пластыцы набліжаецца да ўзораў беларускага замкавага дойлідства. Два ніжнія ярусы вежы маюць агульныя карнізы з аб’ёмам кафалікона, утвараючы над ім атыкавы ярус. Вышэй яго чацверыкі вежы маюць аднолькавае сячэнне і толькі самы верхні, накрыты традыцыйным для мясцовага замкавага дойлідства пакатым шатром-«каўпаком», крыху вузейшы, што робіць яе візуальна больш вытанчанай і дынамічнай. Уваход зроблены не па восі сіметрыі будынка, як звычайна, а з паўднёвага боку ніжняга яруса вежы, што абумоўлена магчымасцю трапіць у яго толькі праз умацаваную браму, што прарэзвае паўднёвы бок земляных умацаванняў замчышча.

Паводле інвентара 1772 г. у касцёле даміниканцаў было 5 алтароў: галоўны мураваны і чатыры драўляныя, на драўляных хорах над уваходам месціўся арган [7]. У 1832 г. дамініканскі кляштар у Заслаўі, як амаль усе дамініканскія кляштары былога Вялікага княства Літоўскага, ліквідавалі за іх актыўны ўдзел у паўстанні 1830–1831 гг. У 1840 г. храм зноў змяніў канфесійную прыналежнасць і стаў праваслаўнай Спаса-Праабражэнскай царквой *(іл. 1)*, што прывяло да значных пераробак. Над дахам быў надбудаваны несапраўдны купал. У 1968–1972 гг. будынак рэстаўраваны, з мэтай чаго праведзены яго грунтоўныя гісторыка-археалагічныя даследаванні. Помнік уваходзіць у гісторыка-культурны запаведнік «Заслаўе» і выкарыстоўваецца на сённяшні дзень як праваслаўная царква.

Мураваны парафіяльны касцёл, на месцы старога драўлянага, узведзены ў 1774 г. па фундацыі тагачаснага ўладальніка Заслаўя падканцлера Вялікага княства Літоўскага Антонія Пшэздзецкага, кансекраваны пад тытулам Нараджэння Дзевы Марыі ў 1799 г. [8]. Пасля наступнага паўстання 1863–1864 гг., у 1867 г., і гэты храм пе-



*Іл. 1. Спаса-Праабражэнская царква (б. кальвінскі збор) у Заслаўі*

радалі пад праваслаўную царкву Нараджэння Багародзіцы, якая дзейнічала ў ім да 1941 г. *(іл. 2)*. Пасля доўгачасовага занядбання будынак у 1989 г. вернуты каталікам і рэстаўраваны. Хаця параўнальна з былым кальвінскім зборам, помнікам мясцовага рэнесанса, у навуковай і энцыклапедычнай літаратуры парафіяльнаму касцёлу ў Заслаўі надаецца значна менш увагі, ён мае вялікую гісторыка-культурную каштоўнасць як помнік архітэктуры позняга беларускага барока, званага ў мастацтвазнаўстве віленскім.

Як мастацтвазнаўчае паняцце «віленскае барока» сфармулявана і распрацавана ў 1930-я гг. у навуковых колах Заходняй Беларусі, цэнтрам якой па-ранейшаму заставалася Вільня – гістарычны дзяржаўны і



*Іл. 2. Касцёл Нараджэння Дзевы Марыі ў Заслаўі*

культурны асяродак нашага краю. У азначаным тэрміне адлюстравана ўсведамленне адметнасці і непаўторнасці гэтага каштоўнага пласта нацыянальнай культуры. На жаль, праблема віленскага барока не атрымала распрацоўкі ў беларускім мастацтвазнаўстве пасляваеннага часу ў выніку складаных сацыяльна-гістарычных абставін савецкага перыяду: адлучэння Вільні ад нашага краю, негатыўнага стаўлення афіцыйнай ідэалогіі да царквы і сакральнага мастацтва. Пытанні генезісу і спецыфікі віленскага барока на працягу амаль 70 гадоў даследавалі і даследуюць польскія гісторыкі мастацтва, якія надзвычай высока ацэньваюць гэты культурны феномен, праўда, лічачы яго важным унёскам менавіта Польшчы ў гісторыю сусветнай цывілізацыі.

Пры тым, што пэўныя запазычанні і паралелі ў сакральным мастацтве многіх народаў Цэнтральнай Еўропы відавочныя, віленскае барока выступае ў гэтым кантэксце з’явай значнай і самабытнай [9].

У стылістыцы віленскага барока выяўлена падпарадкаванасць коснай матэрыі чалавечай адухоўленасці. Глыбока схаваную, амаль абстрагаваную ў ідэю экспрэсію беларускага барока XVII ст. на познім этапе замяняе свабода і неўтаймаванасць творчай фантазіі, за якой, аднак, схаваны дакладны тэарэтычны і тэхнічны разлік. Пластыка аб’ёмаў становіцца самадастатковым сродкам мастацкай выразнасці, з дапамогай чаго дасягаюцца патрэбныя тэалагічна-эстэтычныя мэты. Адбываецца актывізацыя ўзаемадзеяння прасторы і масы матэрыялу ва ўсіх трох вымярэннях. Узбагачэнню пластыкі спрыяе выкарыстанне крывых ліній ў абрысах планаў і фасадаў, разнастайнасць і варыябільнасць якіх практычна неабмежаваныя. Асаблівую ўзнёсласць святыням віленскага барока надае спецыфічны прапарцыянальны лад з перавагай вертыкальных прапорцый, імкненне да ілюзіяністычных эфектаў і аптычнай карэкціроўкі мастацкага вобраза.

Адметнай рысай архітэктуры заслаўскага касцёла з’яўляецца кампактнасць аб’ёмаў і значная таўшчыня сцен (да 2 м). Невялікі неф складаецца ўсяго з дзвюх травей (а не трох, як звычайна), перакрытых цыліндрычнымі скляпеннямі з распалубкамі і адзінкавымі падпружнымі аркамі, што пераходзяць у пілястры карынфскага ордэра. Сцены нефа пры гэтым маюць значную вышыню і, каб забяспечыць іх уласную ўстойлівасць, яны зроблены больш масіўнымі. Роўнавысокая з нефам выцягнутая апсіда прэсбітэрыя з паўкруглым алтарным завяршэннем таксама мае масіўныя сцены, у тоўшчы якіх укампанаваны лесвіцы ў крыпту. Па баках вімы прэсбітэрыя сіметрычна размешчаны даволі вялікія сакрысціі.

Празмерная вышыня аднанефавых познебарочных касцёлаў, што стварала пэўныя канструкцыйныя цяжкасці, тлумачыцца, на наш погляд, жаданнем бачыць на іх галоўным фасадзе стаўшыя візуальна прывычнымі і ўзорнымі прапорцыі фасадаў трохнефавых базілік, якія ў перыяд віленскага барока набылі вялікі ордэр выцягнутых прапорцый, адпаведны вышыні цэнтральнага нефа [10]. У трохнефавых базіліках надзейнасць скляпенняў і устойлівасць апорных канструкцый такіх прапорцый забяспечвалася з дапамо-

гай бакавых нефаў. Калі ж прапарцыянальны лад аднанефавага храма імітаваў прапорцыі цэнтральнага нефа трохнефавай базілікі, то для забеспячэння яго ўстойлівасці і пагашэння распора скляпенняў былі неабходныя дадатковыя канструкцыйныя прыёмы, напрыклад, павялічэнне таўшчыні сцен, узмацненне падпружных арак і пілястраў-пілонаў, увядзенне ў падоўжныя бакавыя сцены разгрузачных арак, якія выконвалі функцыю міжнефавых аркад (у шэрагу выпадкаў мураванае скляпенне заменена драўляным карабавым ці люстэркавым скляпеннем).

Мастацкую адметнасць вобразу святыні надае незвычайная аднавежавая глыбінна-прасторавая структура фасада-нартэкса, дзе зноў жа геаметрычна строгія лініі заменены цякучай пластыкай фігурных абрысаў і шматлікіх раскраповак ордэра. Па-мастацку самастойная кампазіцыя фасада спачатку выступае як куліса за межы нефа крывалінейнымі пілонамі, затым падугамі злучаецца са скошанымі гранямі вежы. Унутры структура фасаднай часткі храма яшчэ больш складаная: авальнае ўваходнае памяшканне перацякае ў хвалістую неакрэсленую прастору нартэкса, над якім размешчаны арганныя хоры з вітымі ўсходамі ў бакавых пілонах. На хорах месціліся «арганы на 8 галасоў». Падоўжна-восевую кампазіцыю інтэр’ера акцэнтуе мураваны 4-калонны алтар з 2 анёламі «цудоўнай ляпной работы» [11].

Да падзелаў Рэчы Паспалітай вежа галоўнага фасада парафіяльнага касцёла ў Заслаўі не была завершана. Падчас прыстасавання яго пад царкву вянчаючыя масы будынка атрымалі рысы псеўдарускага стылю, што можна бачыць на фотаздымку пачатку ХХ ст. Над нефам быў узведзены вялікі несапраўдны купал, а над галоўным фасадам пастаўлена чацверыковая званіца. Пры рэстаўрацыі касцёла над яго ўваходным аб’ёмам надбудавалі ўзнёслую сплошчаную вежу-званіцу, амаль дакладную копію з вежы на фасадзе ружанскай уніяцкай царквы, аўтарства якой належыць прыдворнаму архітэктару Сапегаў нямецкага паходжання Я. С. Бекеру. Хто быў стваральнікам заслаўскага касцёла Нараджэння Дзевы Марыі не вядома. Часам яго аўтарства прыпісываюць архітэктару-італьянцу Карла Спампані, які шмат працаваў у Заслаўі па заказах Пшэздзецкіх. Але выразная познебарочная стылістыка святыні не адпавядае творчаму почырку

гэтага майстра стылю класіцызма. Хутчэй, парафіяльны храм быў змураваны мясцовымі манахамі-дамініканцамі, якія звычайна будавалі свае святыні ўласнымі сродкамі. Магчыма, што «абрыс» будучага касцёла склаў славуты архітэктар-дамініканец Людвік Грынцевіч, які атрымаў прафесійную адукацыю ў Рыме. Але гэта толькі гіпотэза, заснаваная на адметнай мастацкай стылістыцы выдатнага помніка віленскага барока ў старажытным Заслаўі.


1. Туристическая мозаика Беларуси / А. И. Локотко и др. — Минск : Беларуская навука, 2011. — С. 520–521.
2. Насовіч В. Л. Генеалагічныя табліцы старадаўніх княжацкіх і магнацкіх беларускіх родаў 12–18 стагоддзяў / В. Л. Насовіч. — Мінск ; БелЭ, 1993. — 168 с.
3. Габрусь Т. Саборы помняць усё: Готыка і рэнесанс у сакральным дойлідстве Беларусі / Т. Габрусь. — Мінск : Беларусь, 2007. — С. 132–147.
4. Ткачоў М. А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII–XVIII ст. / М. А. Ткачоў — Мінск : Навука і тэхніка, 1978. — С. 58.
5. Augustyniak U. Testamenty ewangelików reformowanych w Wielkim Księstwie Litewskim / Urszula Augustyniak — Warszawa, 1992. — Testament Jana Hlebowicza wojewody trockiego. 28 lipca 1590 r. — S. 60–75.
6. Каталіцкія святыні: Мінска-Магілёўская архідыяцэзія / тэкст і фота А. Яроменкі. — Мінск : Про Хрысто, 2003. — Частка 1. — С. 173–176.
7. Borejko-Chodzko J. Diecezja Mińska około 1830 roku / J. Borejko-Chodzko. — Lublin, 1998. — I. Struktury parafialne. — 26 c.
8. Nasze kościoły. Djecezja Mińska / pod red. J. Żyskara. — Warszawa – Petersburg, 1912. — T. 1. — S. 163.
9. Morelowski M. Problemy wileńskiej architektury barokowej XVII–XVIII w. / M. Morelowski // Prace i materiały sprawozdawcze sekcji historyi sztuki t-wa przyj. nauk. — Wilno, 1935. — T. 2. — S. 245–256.
10. Габрусь Т. В. Мураваныя харалы: Сакральная архітэктура беларускага барока / Т. В. Габрусь. — Мінск : Ураджай, 2001. — С. 262–263.
11. Maliszewski Ed. Przewodnik po gubernii Mińskiej / Edward Maliszewski. — Warszawa, 1919. — S. 10.